## ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ

**“Студэнцкая Рада”** — недзяржаўная моладзевая арганізацыя, якая з’явілася 10 сакавіка 2008 года і з таго моманта займаецца абаронай правоў студэнтаў у Беларусі. Арганізацыя зарэгістравана ў 2008 годзе ў форме моладзевай прафсаюзнай групы ў незалежным прафсаюзе РЭП (работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці). Дзейнасць СтудРады адбываецца пераважна ў Мінску.

**Мэта** – абарона правоў студэнтаў.

**Задачы:**

- распаўсюджванне каштоўнасці правоў студэнтаў у студэнцкай супольнасці;
- стварэнне і прасоўванне механізмаў абароны правоў студэнтаў.

**Накірункі дзейнасці арганізацыі:**

- збор дадзеных аб парушэннях правоў студэнтаў;
- юрыдычная кансультацыя па парушэннях правоў студэнтаў;
- адвакацыйныя кампаніі па прасоўванню інтарэсаў студэнтаў;
- адукацыйна-асветніцкая дзейнасць (правядзенне адукацыйных трэнінгаў, семінараў, праграм, інфармацыйных кампаній, асветніцкіх фестываляў).

Спасылка на карту парушэнняў
і анлайн-анкету ў фармаце QR-коду

studrada.org

facebook.com/studenckaja.rada

vk.com/studenckaja.rada

students.rada@gmail.com

РАБІ НЕЧАКАНАЕ
СТУДЭНЦКАЯРАДА

ЦЭНТР ДАПАМОГІ СТУДЭНТАМ

# ЦЭНТР ДАПАМОГІ СТУДЭНТАМ

ЦЭНТР ДАПАМОГІ СТУДЭНТАМ

# ШТО ГЭТА?

**Цэнтр дапамогі студэнтам** - гэта шматкампанентны сервіс збору і аналізу інфармацыі аб парушэннях правоў студэнтаў і акадэмічных свабод у навучальных установах Беларусі, які працуе ў межах дзейнасці арганізацыі "Студэнцкая Рада". У дзейнасць сервіса таксама ўключаецца бясплатная юрыдычная кансультацыя студэнтаў па пытаннях, якія звязаныя з навучальным працэсам і парушэннямі іх правоў.

# НАВОШТА?




**"Студэнцкая Рада"** імкнецца адсочваць парушэнні правоў студэнтаў у рэальным часе не толькі ў Мінску, але і па ўсёй Беларусі, бо для эфектыўнай абароны важна валодаць актуальнай і пастаяннай інфармацыяй. Для вывучэння гэтай сітуацыі намі была створана анлайн-анкета, якую можа запоўніць любы беларускі студэнт, калі лічыць, што ягоныя правы былі парушаны. Пасля атрымання гэтай інфармацыі мы правяраем яе на адпаведнасць усім крытэрам і візуалізуем на карце, каб Вам было зручней даведацца, які з беларускіх універсітэтаў у большай ці меншай ступені парушае правы студэнтаў.

# ЯК ПАВЕДАМІЦЬ ПРА ПАРУШЭННЕ?

зафіксуй парушэнне

запоўні анлайн-анкету

атрымай юрыдычную кансультацыю

адсочвай стан за парушэннямі правоў студэнтаў на нашым сайце
**studrada.org**